# *Раздзел 3.* ПАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМА ГРАМАДСТВА

## 3.1. Палітычная сістэма: сутнасць, структура, тыпы

Адной з цэнтральных праблем курса паліталогіі з'яўляецца праблема палітычнай сістэмы грамадства. Гэту сістэму можна вызначыць як сукупнасць адносін па выкарыстанні палітычнай улады пануючым класам або ўсім народам.

Палітычная сістэма прадстаўляе сабой адну з частак або падсістэм сукупнай грамадскай сістэмы. Яна ўзаемадзейнічае з іншымі яе падсістэмамі: сацыяльнай, эканамічнай, прававой, ідэалагічнай, этычнай, культурнай, якія ствараюць яе грамадскае акружэнне і яе грамадскія рэсурсы. Чым вызначаецца вядучае становішча палітычнай сістэмы грамадства перад іншымі сістэмамі? Цэнтральнае становішча палітычнай сістэмы ў структуры знешняга і ўнутранага акружэння вызначаецца вядучай арганізацыйнай і рэгулятыўна-кантралюючай роллю самой палітыкі.

Пры вывучэнні гэтай праблемы мэтазгодна акцэнтаваць увагу на наступных важных пытаннях:

1. Узнікненне і паходжанне палітычнай сістэмы грамадства.
2. Сутнасць і структура палітычнай сістэмы.
3. Функцыі і тыпы сучасных палітычных сістэм.

① Усякае класавае грамадства заўсёды палітычна аформлена, мае механізм улады, які забяспечвае яго нармальнае функцыянаванне ў якасці адзінага сацыяльнага арганізма.

Палітычная сістэма грамадства — катэгорыя гістарычная. Яна з'явілася ў класавым грамадстве ў перыяд распаду першабытна-абшчыннага ладу, на зараніку рабаўладальніцкай фармацыі.

Ва ўмовах рабаўладання палітычная сістэма выступала перш за ўсё як сістэма дзяржаўных органаў. Пры гэтым яна ўключала ў сябе сувязі як па вертыкалі, так і па гарызанталі (ствараючы адзінства ўсіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных органаў). І калі сувязі па гарызанталі пры унітарнай пабудове палітычнага жыцця былі прэрагатывай прадстаўніка вышэйшай улады (намесніка манарха), то вертыкальная — самой вышэйшай улады (манарха). Пры федэратыўнай і канфедэратыўнай пабудове палітычная сістэма ўяўляе сабой сукупнасць сувязей паміж дзяржавамі як суб'ектамі федэрацыі і канфедэрацыі[1].

---

[1] *Андрэй С. С.* Палітычныя сістэмы і палітычная арганізацыя грамадства // Сацыяльна-палітычныя навукі. 1992. №1. С. 25.

З'яўленне ў рабаўладальніцкім грамадстве палітычных партый азначала фарміраванне прынцыпова новай палітычнай сістэмы — сістэмы партыйнай. У адрозненне ад сістэмы дзяржаўных органаў яна злучала не ўладныя органы, а грамадскія арганізацыі. Узаемадзеянне ж партыйных і дзяржаўных палітычных сістэм вяло да стварэння трэцяй іх разнавіднасці — партыйна-дзяржаўных, дзе абедзве сістэмы выступалі падсістэмамі. Гэта, безумоўна, не надзяляла партыі ўладнымі паўнамоцтвамі, але забяспечвала ім больш непасрэдны ўплыў на палітыку дзяржавы.

Аднак цэласнасць палітычнай сістэмы дзяржаўных органаў па-ранейшаму вызначалася межамі ўстойлівасці эканамічных сувязей. Найбольш наглядна гэта праявілася ў раннефеадальны перыяд, калі поўнае панаванне натуральнай гаспадаркі магло парадзіць жыццяздольныя дзяржаўныя стварэнні ў межах уласнасці феадала. Менавіта ён выступаў у ролі сістэмастваральнага суб'екта.

З'яўляючыся вярхоўным выразнікам класавых інтарэсаў феадалаў у адносінах да запрыгоненага сялянства, кароль выступаў у якасці нейкага аб'ядноўчага цэнтра ў час сутыкнення феадалаў аднаго з другім і барацьбы са знешнімі ворагамі. Нягледзячы на такую сацыяльную значнасць, сістэма цэнтральнай улады не станавілася больш устойлівай (прыкладам можа служыць распад у IX ст. імперыі Карла Вялікага, якая знаходзілася на тэрыторыі сучасных Францыі, Германіі, і Італіі). Для гэтага ёй не хапала тых самых эканамічных сувязей, якія фарміраваліся на аснове грамадскага падзелу працы.

Стварыць іх паміж натуральнымі гаспадаркамі феадалаў было практычна немагчыма. Яны станавіліся рэальнасцю па меры эканамічнага росту буржуазіі. Уздым прамысловасці і гандлю прывёў да фарміравання агульнапалітычнага інтарэсу ў межах усёй краіны. Толькі ва ўмовах, калі эканамічныя сувязі пранізваюць усю краіну, становіцца магчымым фарміраванне палітычнай сістэмы (дзяржаўных органаў) у яе маштабах.

Развіццё феадальнай палітычнай сістэмы на ўзроўні каралеўскай улады ішло шляхам надпарадкавання палітычных структур феадалаў вышэйшым (каралеўскім) органам улады, калі частка іх судовых спраў, чаканка манет сталі прэрагатывай караля і г.д.

Асобую палітычную сістэму, якая прэтэндавала на выключнасць ва ўмовах сярэднявечча, стварала царква. У ролі сістэмастваральнага суб'екта выступіла папства, а матэрыяльнымі носьбітамі сувязей і адносін сталі не толькі цэрквы (царкоўныя абшчыны), але і манастыры, манаскія ордэны. Пры гэтым некаторыя з іх стварылі свае дзяржавы (палітычныя сістэмы дзяржаўных органаў). Найбольш тыповым з іх быў Тэўтонскі

ордэн (заснаваны ў канцы XII ст.), які стварыў сваю дзяржаву ў Прыбалтыцы (тэрыторыя будучага герцагства Прусія) і імкнуўся да заваявання Польшчы, народаў Прыбалтыкі і паўночна-заходняй Русі (перш за ўсё Ноўгарада і Пскова). З усіх палітычных сістэм эпохі феадалізму самай устойлівай была царкоўная, якая ўмацоўвалася з дапамогай адміністрацыйных сувязей.

Ледзь атрымаўшы феадальную палітычную сістэму, буржуазія паслядоўна ішла наперад да становішча сістэмастваральнага суб'екта феадальна-буржуазнай (а затым буржуазна-феадальнай) палітычнай сістэмы. Узрастаючая эканамічная магутнасць дазваляла ёй купляць уладу ў караля і дваранства, а затым па меры рэалізацыі ідэі падзялення ўлад, захопліваць вызначаючае становішча ў палітычнай сістэме (заканадаўчай уладзе) і прымушаць караля і дваранства, у руках якіх знаходзілася выканаўчая ўлада, адстойваць яе інтарэсы, рэалізуючы прынятыя парламентам законы.

Буржуазная эпоха парадзіла прынцыпова новую сацыяльную з'яву ў палітычным жыцці грамадства — устойлівае палітычнае супрацьборства двух палітычных сістэм: буржуазнай і пралетарскай. Пераважнае становішча ў ім займае буржуазія, таму што яе сістэма ўключае ў сябе органы ўлады.

У адрозненне ад буржуазнай, палітычная сістэма пралетарыяту толькі змагаецца за ўладу. З пачаткам сацыялістычнай рэвалюцыі мяняецца матэрыяльная аснова сувязей і адносін у палітычных сістэмах пралетарыяту і буржуазіі. Дзяржаўныя палітычныя структуры становяцца набыткам пралетарыяту, што ставіць яго ў пераважнае становішча ў грамадстве.

У грамадска-эканамічных фармацыях: рабаўладальнай, феадальнай і капіталістычнай унутрана супярэчлівы характар эканомікі накладвае свой непазбыўны адбітак на прыроду і характар існуючых у іх межах не толькі эканамічных, сацыяльных і духоўных, але і палітычных сістэм.

② Палітычная сістэма грамадства — гэта не злучэнне класаў, нацый, і іншых сацыяльных груп і асоб. Яе кампанентамі выступаюць перш за ўсё пэўныя інстытуты (арганізацыі, аб'яднанні, установы), якія прадстаўляюць інтарэсы тых ці іншых класаў (слаёў), што з'яўляюцца першаснымі ўдзельнікамі палітыкі, палітычных адносін. ***Палітычная сістэма грамадства — гэта сістэма дзяржаўных і недзяржаўных сацыяльных інстытутаў, якія ажыццяўляюць пэўныя палітычныя функцыі.***

***Палітычная сістэма прадстаўляе сабой складаную, разгалінаваную сукупнасць розных палітычных інстытутаў, сацыяльна-палітычных супольнасцей, форм узаемадзеянняў і ўзаемаадносін паміж імі, у якіх***

*рэалізуецца палітычная ўлада.* Дадзенае паняцце было ўведзена ў паліталагічны зварот ў сярэдзіне XX ст. і звязана з імёнамі канадскага палітолага Дэвіда Істона і амерыканскага палітолага Габрыэля Алмонда.

Паняцце палітычнай сістэмы дазваляе нам акрэсліць мэты палітычнага жыцця, яго кампаненты, функцыі, сувязі паміж імі. Па сваім аб'ёме катэгорыя "палітычная сістэма грамадства" блізкая да катэгорыі "палітычнае жыццё грамадства", аднак калі паняцце "палітычнае жыццё" характарызуе сам палітычны працэс у яго дынаміцы, актыўнасці, то палітычная сістэма раскрывае кампаненты палітычнага працэсу, яго якасны бок, г.зн. "палітычнае" ў іх разглядаецца пад рознымі пунктамі погляду.

Паняцце "сістэма" выступае адным з асноўных у паліталогіі. Гэта паняцце дазваляе скласці ўяўленне аб грамадстве ў выглядзе абстрактнай і спрошчанай мадэлі рэальнага грамадства або яго асобных элементаў.

Паняцце "сістэма" прыйшло да нас з электронікі і кібернетыкі. Паліталогія разглядае сістэму як інтэграванае паняцце, якое ўключае працэсы, тэндэнцыі, структуры (інстытуты), паводзіны грамадзян, калектываў і арганізацый, грамадскую актыўнасць (або пасіўнасць) дзеяння і ўзаемадзеяння. Тэрмін "сістэма" абазначае ў паліталогіі ўсе дзеянні і структуры, якія так ці інакш уплываюць на працэс прыняцця і здзяйснення палітычных рашэнняў.[1]

Паняцце "*структура*" ў паліталогіі азначае сукупнасць узаемазвязаных функцый, норм, каштоўнасцей, інстытутаў, якія прадпісваюць, забараняюць, тармозяць, дазваляюць некаторыя тыпы паводзін. Яно характарызуецца адноснай устойлівасцю, нязменнасцю, нягледзячы на факт змены людзей і пакаленняў (структура ўрада, палітычнай партыі і г. д.).

Палітычная сістэма ўключае ў сябе адпаведныя палітычныя структуры, працэсы і падсістэмы, узаемасувязі, якія дзейнічаюць у яе рамках, а таксама тыя, што выходзяць за яе ўласныя рубяжы.

Можна выдзеліць чатыры групы асноўных элементаў палітычнай сістэмы любога грамадства:

1) палітычныя арганізацыі;

2) палітычныя адносіны;

3) палітычныя і прававыя нормы;

4) палітычную свядомасць і палітычную культуру.

Чатыры групы асноўных элементаў палітычнай сістэмы характарызуюць розныя бакі яе жыццяздольнасці. Так, палітычныя арганізацыі — гэта дзяржава, палітычныя партыі і іншыя арганізацыі, якія валодаюць

[1] *Матвеев Р. Ф.* Теоретическая и практическая политология. М., 1993. С. 51.

уладай, або аказваюць значны ўплыў на яе. Палітычныя адносіны адлюстроўваюць рэальныя паводзіны ўсіх сацыяльных груп. Палітычныя і многія прававыя нормы вызначаюць у фармалізаваным выглядзе характар палітычных адносін у грамадстве. Палітычная свядомасць і палітычная культура таксама ёсць атрыбуты ўсіх удзельнікаў палітычных адносін, кіруючых і кіруемых.

Галоўным сувязным звяном палітычнай сістэмы з'яўляецца ***палітычная ўлада***, якая надае палітычнай сістэме цэласнасць, вылучае яе з грамадства ў якасці адносна самастойнай падсістэмы. Палітычная ўлада выступае сутнаснай характарыстыкай эканамічнага пануючага класа, выражэннем яго волі і пануючага становішча ў грамадстве. Але яна як вярхоўная ўлада грамадства вызначае тып усёй палітычнай сістэмы, з'яўляецца яе важнейшым кампанентам, цэнтральным звяном, што стварае сістэмную аснову, на якой грунтуюцца ўсе астатнія кампаненты палітычнай сістэмы.

Стрыжнёвым (асноўным) кампанентам палітычнай сістэмы грамадства з'яўляецца *дзяржава*. Яна выступае асноўным носьбітам палітычнай улады, асноўным сродкам рэалізацыі класавых інтарэсаў і ў сувязі з гэтым — галоўным суб'ектам і адначасова галоўным аб'ектам палітычнай дзейнасці і палітычных адносін.

У палітычнай сферы носьбітамі, матэрыяльнымі субстратамі палітычнай дзейнасці выступаюць арганізацыі, перш за ўсё ***палітычныя партыі***. Праз іх сацыяльна-гістарычныя супольнасці ажыццяўляюць сваю функцыю суб'екта палітычнай дзейнасці, у іх матэрыялізуюцца палітычныя адносіны, яны выступаюць як згусткі, устойлівыя вузлы.

Важным кампанентам палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства з'яўляюцца прадпрымальніцкія арганізацыі.[1] Ва ўмовах капіталізму ў сувязі з абвастрэннем класавай барацьбы і ўзмацнення адноснай самастойнасці дзяржавы пануючы клас ужо не можа абысціся дзяржавай і ўласнымі палітычнымі партыямі для абароны сваіх інтарэсаў. Прадпрымальніцкія арганізацыі ўзніклі спачатку як эканамічныя арганізацыі, закліканыя адлюстроўваць і абараняць эканамічныя інтарэсы класа буржуазіі. У цяперашні час яны адыгрываюць важную ролю ў ператварэнні эканамічнай магутнасці манапалістычнага капіталу ў палітычную магутнасць. У іх дзейнасці, сувязях з дзяржавай найбольш выразна праяўляецца працэс зрошчвання сілы манаполій з сілай дзяржавы.

Палітычная сістэма грамадства, у якім ёсць антаганістычныя класы, у якасці неад'емнага кампанента ўключае ў сабе царкву. Царква ў класава

---

[1] *Лузан А. А.* Палітычнае жыццё грамадства: пытанні тэорыі. Кіеў, 1989. С. 61

антаганістычным грамадстве з'яуляецца арганізацыяй палітычнай. Ні адно класава-антаганістычнае грамадства не магло абысціся без царквы як рэгулятара грамадскіх адносін, актыўнаї палітычнай сілы (і не толькі духоўнай) у справе захавання існуючага ладу. Падкрэслім, што ў якасці субстрактнага кампанента палітычнай сістэмы выступае не рэлігія, а царква.[1]

Палітычная сістэма існуе як цэласнасць, аддзеленая пэўнымі межамі ад яе навакольнага асяроддзя. У структуры палітычнай сістэмы прынята выдзяляць такія яе сістэмы, як *інстытуцыянальная, нарматыўная, функцыянальная, камунікатыўная, культурная.*

Што адрознівае палітычную сістэму ад іншых сістэм грамадства?

Па-першае, *вяршэнства палітычнай сістэмы*. Гэта значыць, што з яе дапамогай ажыццяўляецца палітычная ўлада ў грамадстве, што прымаемыя ў яе рамках рашэнні абавязкова выконваць усяму грамадству і кожнай яго падсістэме.

Па-другое, *абумоўленасць палітычнай сістэмы грамадскім асяроддзем, у першую чаргу сацыяльна-эканамічнай структурай.* Як сродак ажыццяўлення палітычнай улады палітычная сістэма тым не менш уяўляе сабой надбудову, дэтэрмінаваную эканамічным і сацыяльным базісам грамадства.

Па-трэцяе, *адносная самастойнасць палітычнай сістэмы* вызначаецца наяўнасцю спецыяльнага механізма структур, роляў, функцый, груп. Палітычная сістэма ў значнай ступені фармалізавана, бо адносіны ў яе рамках, як правіла, рэгулююцца спецыяльнымі нормамі — прававымі і палітычнымі.

Палітычная сістэма мае структурны характар, г.зн. уключае часткі або падсістэмы рознай складанасці, іх элементы і адносіны паміж імі. Яна складаецца з падсістэм трох узроўняў улады і палітычных адносін: двух інстытуцыянальных макрасістэмных — вышэйшага, або верхняга (мегаўзровень), сярэдняга, або прамежкавага (мезаўзровень) і неінстытуянальнага – ніжняга, масавага (мікраўзровень).

На інстытуцыянальным макрасістэмным узроўні палітычная сістэма ўключае цэнтральны апарат дзяржаўнай улады (раздзеленай у дэмакратычным грамадстве і ў прававой дзяржаве на заканадаўчую, выканаўчую і судовую). Від палітычнай сістэмы залежыць ад тыпу грамадства і праўлення: прыярытэтнай улады кіраўніка ўрада, прэзідэнта, манарха, парламента, правячай партыі, вярхоўнага або канстытуцыйнага суда. Непасрэд-

[1] *Яблакау І. М.* Сацыялогія рэлігіі. М., 1979. С. 115-122.

на ў макрасістэму ўваходзяць розныя формы палітычнай апазіцыі (парламенцкай, партыйнай).

Аналагічная па сваёй пабудове сярэдняя (меза-) структура палітычнай сістэмы. Яна створана апаратам кіравання, органамі выбарнай і прызначаемай улады, якія непасрэдна зліты са структурамі макраўзроўню, але складаюць яго перыферыю. Яны размешчаны ў палітычнай прасторы паміж вышэйшымі эшалонамі дзяржаўнай улады і грамадствам, якое яны звязваюць с дзяржавай. Гэта так званыя апараты і органы, рэгіянальная і муніцыпальная адміністрацыя, Саветы розных рангаў, іерархія партыйных, прафсаюзных і іншых асацыятыўных структур (грамадстваў, саюзаў), буйныя прадпрыемствы, лідэры эканомікі, органы правасуддзя і аховы парадку, другія ўстановы, праз якія здзяйсняецца палітычная сацыялізацыя.

Мікраўзровень палітычнай сістэмы ствараецца масавым удзелам грамадскіх груп, класаў і слаёў, грамадзян супольніцтва ў палітычным жыцці: членствам у масавых палітычных або непалітычных, але ўплывовых арганізацыях, удзелам у масавых палітычных акцыях падтрымкі ўлады або пратэсту, у сацыяльным кантролі палітыкі. На мікраўзроўні фарміруюцца палітычныя народныя рухі, зараджаюцца палітычныя групоўкі і партыі, фарміруецца грамадская думка, складваецца палітычная культура грамадства.

Палітычная сістэма сфарміравана па прынцыпу пірамідальнай іерархіі: з масавай сацыяльнай базай у аснове, вяршыняй дзяржаўнай улады ў вышэйшым яе эшалоне. Такім жа чынам пабудаваны і яе падсістэмы, якія маюць вертыкальныя структуры (ад масавай базы да кіруючых устаноў): партыі, буйныя грамадскія арганізацыі, саюзы і г.д. На кожным з узроўняў, на якія раздзелена палітычная сістэма, ствараюцца спецыфічныя структуры і адносіны паміж імі.

③ Любая грамадская сістэма (у тым ліку і палітычная) як падсістэма больш агульнай сістэмы (якой выступае грамадства) з'яўляецца такой не толькі ў сілу сістэмнай якасці, але і па прычыне наяўнасці ў ёй азначанай функцыі, якую яна выконвае адносна іншых грамадскіх падсістэм і грамадства ў цэлым. Менавіта таму, аналіз кампанентнага складу і структуры палітычнай сістэмы неабходна дапоўніць аналізам яе функцыянальнага прызначэння.

Паняцце функцыі найбольш дэталёва распрацавана ў юрыдычнай навуцы ў прымяненні да дзяржавы, дзе пад функцыямі апошняй разумеюцца асноўныя напрамкі (і бакі) у яе дзейнасці. Існуюць розныя думкі аб функцыях палітычнай сістэмы грамадства. На думку Ф. М. Бурлацкага,

асноўнымі функцыямі палітычнай сістэмы з'яўляюцца:

а) вызначэнне мэт і задач грамадства;

б) мабілізацыя рэсурсаў для дасягнення мэт, якія ставяць перад грамадствам яго кіруючыя сацыяльна-класавыя сілы;

в) інтэграцыя ўсіх элементаў грамадства;

г) легітымізацыя, пад якой разумеецца дасягненне мінімальна неабходнай ступені адпаведнасці рэальнага палітычнага жыцця афіцыйным палітычным і прававым нормам[1].

Прымаючы маштабнасць і разнастайнасць праяўлення дзеяння палітычных сістэм, можна выдзеліць наступныя іх функцыі:

1) палітычнае мэтамеркаванне;

2) уладна-палітычная інтэграцыя грамадства;

3) рэгуляванне рэжыму сацыяльна-палітычнай дзейнасці;

4) забеспячэнне цэласнага кіраўніцкага ўздзеяння на грамадскія працэсы.

Функцыя палітычнага мэтамеркавання мае першараднае значэнне для існавання і развіцця любой палітычнай сістэмы. Сацыяльныя супольнасці: народ, класы, нацыі, слаі, групы, калектывы, апасродкуючы свае інтарэсы ў дзейнасці інстытутаў палітычнай сістэмы, імкнуцца пазнаць аб'ектыўную рэальнасць і выпрацаваць шляхі руху. Усё гэта мае складаны характар не толькі ў галіне сацыяльнага пазнання з уласцівымі яму метадамі вывучэння і выкарыстання аб'ектыўных заканамернасцей, прагназіравання, выяўлення супярэчнасцей і праблем, якія патрабуюць рашэння, вызначэння мэт і шляхоў іх дасягнення, але і сацыяльнага дзеяння, барацьбы інтарэсаў, пошукаў шляхоў іх узгаднення, знаходжання форм выражэння інтарэсаў і наданне ім агульнага значэння.

Мэта выступае як прадбачаны будучы стан, да якога свядома імкнуцца людзі і іх арганізацыі. Палітычнае мэтамеркаванне абазначае перш за ўсё выпрацоўку ўласных палітычных мэт, якія закранаюць зменлівасць улады, палітычных інстытутаў, развіццё дэмакратыі, класавых, нацыянальных адносін і г. д. Яно ўключае і ўстанаўленне мэт развіцця іншых сфер грамадскага жыцця — эканамічнай, сацыяльнай і г.д. Замацаванне мэт у палітычных дакументах партый, у канстытуцыях і законах абазначае наданне ім усеагульнага статусу. Адначасова адбываецца ранжыраванне мэт з улікам іх прыроды і рэальных магчымасцей ажыццяўлення (тактычныя, стратэгічныя мэты, вызначэнне прыярытэтаў у іх дасягненні).

[1] *Бурлацкий Ф. М., Галкин А. А.* Современный Левиафан: Очерки политической социологии капитализма. М., 1985. С. 31-32.



Выбар і ўстанаўленне мэт патрабуюць сур'ёзнай палітычнай дзейнасці, якая абапіраецца на навуковы аналіз працэсаў, што адбываюцца ў палітычным жыцці, на ўсебаковыя разлікі, прагнозы, ацэнкі магчымых альтэрнатыў палітычнага курсу. На Захадзе атрымала развіццё "навука аб будучым" — футуралогія, якая занята прадказаннем перспектыў, распрацоўкай "сцэнарыяў" унутранага і міжнароднага развіцця. Функцыя ўладна-палітычнай інтэграцыі грамадства абазначае выкарыстанне палітыкі і ўлады для выяўлення волі пануючых класаў, усяго народа і падпарадкавання ёй усіх асноўных дзеянняў у грамадстве. Гаворка ідзе, па-першае, аб агульным абавязковым выкананні дзяржаўных загадаў, якія абапіраюцца на прымусовую сілу; па-другое, аб выкарыстанні права, закону для агульназначнага рэгулявання грамадскіх адносін; па-трэцяе, аб наданні палітыцы грамадскага аўтарытэту, аб ступені развіцця або дэмакратыі і самакіравання, або аўтарытарнага палітычнага рэжыму і палітычнага адчужэння; па-чацвертае, аб вядомай субардынацыі і каардынацыі інстытутаў палітычнай сістэмы і іх звенняў.

Вялікае значэнне мае функцыя рэгулявання рэжыму сацыяльна-палітычнай дзейнасці ў грамадстве. Маецца на ўвазе ўстанаўленне такіх спосабаў паводзін і дзейнасці людзей, груп, арганізацый, форм іх узаемаадносін паміж сабою і дзяржавай, якія б забяспечвалі выкананне агульных інтарэсаў і ўстойлівасці грамадскіх адносін. Сацыяльна-палітычныя нормы ўкараняюць ідэалы і каштоўнасці, стымулы і матывы грамадскіх паводзін, прызваныя дапамагчы пераадолець канфлікты і ўстанаўленне выгаднага пануючым класам вырашэння палітычных, эканамічных і іншых пытанняў, якія ўзнікаюць у ходзе грамадскага развіцця. Адсюль папус дынамічнасць палітычнага рэжыму нават у рамках адных і тых жа інстытутаў пры змяненні суадносін класавых сіл.

Функцыя забеспячэння цэласнага кіраўніцкага ўздзеяння на грамадскія працэсы выражае патэнцыял палітычнай сістэмы як суб'екта кіравання верхняга ўзроўню. Аб'ектамі кіравання з'яўляюцца грамадства і яго сферы, галіны эканомікі і культуры, рэгіёны, асобныя вытворчыя адзінкі, сацыяльныя супольнасці, а таксама працэсы развіцця, якія ім уласцівы. У ходзе кіравання выкарыстоўваюцца грамадска-прыродныя, матэрыяльныя, людскія рэсурсы, рэгулюецца ў пэўных сацыяльных інтарэсах развіццё вытворчасці, навукі, культуры і г.д., размеркаванне даходаў. Для гэтага ажыццяўляюцца асноўныя функцыі кіраўніцкага цыкла: апрацоўваецца і выкарыстоўваецца інфармацыя, прымаюцца і рэалізуюцца рашэнні, ажыццяўляецца кантроль.

Функцыі палітычнай сістэмы не з'яўляюцца нязменнымі, яны разві-

ваюцца з улікам канкрэтна-гістарычных абставін, дасягнутага ўзроўню эканомікі, культуры, дабрабыту, палітычнай стабільнасці. З'яўляюцца новыя падфункцыі і відазмяняюцца рачей існуючыя. Мяняюцца суадносіны паміж імі. Гістарычны вопыт сведчыць і аб праяўленні "дысбалансу" функцый і няпоўным выкананні некаторых з іх у перыяды ўнутраных крызісаў і войнаў. Каб зразумець і наглядна ўявіць функцыянаванне палітычных сістэм, палітолагі распрацавалі некалькі мадэлей, якія ілюструюць некаторыя бакі гэтых сістэм. Адна з іх была прапанавана Д. Істанам, які выказаў некалькі метадалагічных меркаванняў, карысных пры распрацоўцы агульнай тэорыі палітычных сістэм.

1. Для дакладнага і ўсебаковага разумення руху палітычнай сістэмы неабходны некаторы аб'ем эмпірычных ведаў і некаторы ўзровень абстракцыі і абагульнення. Адны толькі факты, хоць яны і ляжаць у аснове тэарэтычных ведаў, не могуць *тлумачыць*, а тым больш *прагназіраваць* падзеі.
2. Палітычная навука разглядае палітычную сістэму не як суму, а як цэласнае мноства многіх элементаў. Кожны з гэтых элементаў, у сваю чаргу, складаецца з больш простых з'яў і працэсаў.
3. Даследаванне палітычных сістэм прымяняе два асноўныя падыходы. *Сацыяльна-псіхалагічны* надыход накіраваны на вывучэнне паводзін асобы і суб'ектыўных матывацый палітычных працэсаў. Сітуацыйны аналіз дазваляе вывучыць актыўнасць груп, структур і сістэм пад уздзеяннем навакольнага асяроддзя. Гэта навакольнае асяроддзе ўключае сістэмы: фізічную (тапаграфія, геаграфічнае рассяленне грамадзян), прыродную арганічную (флора і фаўна), сацыяльную (дадзены народ, яго традыцыі, канцэпцыі, дзеянні і рэакцыя).
4. Палітычнае жыццё разглядаецца як дынамічна нераўназначная сістэма, у якой пастаянна адбываецца парушэнне і аднаўленне раўнавагі.

Тыпалогія палітычнай сістэмы грамадства заснавана на разнастайных крытэрыях. Тыпалогія сістэм, створаная на аснове марксісцкага падыходу, абапіраецца на такія крытэрыі, як тып фармацыі і характар сацыяльна-эканамічнай структуры. Адпаведна выдзяляюцца *рабаўладальніцкая, феадальная, буржуазная і сацыялістычная палітычныя сістэмы*.

Вялікай разнастайнасцю адрозніваюцца класіфікацыі палітычных сістэм, якія распрацаваны немарксісцкімі аўтарамі і заснаваны на значнай колькасці розных крытэрыяў.

Найбольш распаўсюджана дзяленне палітычных сістэм на *дэмакратычныя, таталітарныя і аўтарытарныя*, заснаваныя на характары палітычнага рэжыму. У дэмакратычнай сістэме дзейнічаюць механізмы кантролю грамадзян за ўладай, сферы дзеяння якой абмежаваны. У таталітарных сістэмах улада пануе над асобай, над грамадствам, рэзка абмяжоўвае правы і свабоды грамадзян. Тут палітычнае развіццё назіраецца ў працэсе дэмакратызацыі — пераходу ад таталітарных або аўтарытарных сістэм да дэмакратычных.



Дастаткова распаўсюджана дзяленне палітычных сістэм на *традыцыйныя і мадэрнізаваныя*. У аснове традыцыйных сістэм ляжыць нецарыўнае грамадзянскае грамадства, слабая дыферэнцаванасць палітычных роляў, харызматычны спосаб абгрунтавання ўлады. У мадэрнізаваных сучасных сістэмах існуе развітое цывільнае грамадства, дыверсіфікацыя палітычных роляў, рацыянальны спосаб абгрунтавання ўлады. З гэтага пункту погляду, працэс палітычнага развіцця бачыцца як пераход ад традыцыйных сістэм да мадэрнізаваных. Г. Алмонд прапанаваў тыпалогію палітычных сістэм, якая абапіраецца на розныя палітычныя культуры з выдзяленнем чатырох тыпаў: англа-амерыканскай, кантынентальна-еўрапейскай, даіндустрыяльнай і часткова індустрыяльнай, таталітарнай палітычных сістэм.

*Англа-амерыканская* сістэма характарызуецца перавагай у ёй такіх каштоўнасцей, як свабода асобы, дабрабыт і бяспека, якіх прытрымліваецца большасць насельніцтва.

*Кантынентальна-еўрапейскія* сістэмы адрозніваюцца фрагментарнасцю палітычнай культуры, якая мае ў цэлым агульную базу. Для іх характэрна суіснаванне старых і новых культур, нераўнамернае развіццё асобных субкультур.

*Даіндустрыяльныя і часткова індустрыяльныя* палітычныя сістэмы таксама маюць змешаную палітычную культуру, якая рэзка адрозніваецца ад гамагеннай амерыканскай культуры. У іх вышэй узровень насілля, які параджаецца цяжкасцямі камунікацыі і каардынацыі. Неабходнасць у прымяненні насілля пры гэтым выклікаецца наяўнасцю адметных палітычных арыентацый, якія параджаюць бар'еры пры іх узгадненнях. Падзяленне ўлад тут нраводзіцца неакрэслена, асобныя элементы палітычнай сістэмы могуць прысвойваць сабе функцыі іншых яе звенняў.

Асаблівасцю *таталітарных* палітычных сістэм з'яўляецца тое, што ў іх забаронены палітычная самадзейнасць і добраахвотныя асацыяцыі, а камунікацыі кантралююцца дзяржавай. Пераважае прымусовы тып палітычнай актыўнасці. Палітычная ўлада канцэнтруецца ў руках бюракратычнага апарата, які кантралюецца маналітнай партыяй.

У залежнасці ад арыентацыі на стабільнасць або перамены палітычныя сістэмы падзяляюцца на кансерватыўныя і трансфармаваныя. Кансерватыўныя палітычныя сістэмы захоўваюць і падтрымліваюць

устаноўлены парадак. Трансфармаваныя сістэмы праводзяць грамадскія пераўтварэнні і адрозніваюцца вялікім дынамізмам, арыентацыяй на правядзенне рэформ. Напрыклад, палітычная сістэма, якая існавала пры Н. С. Хрушчове ў Савецкім Саюзе, можа быць аднесена да палітычнай сістэмы трансфармаванага тыпу, а палітычная сістэма, якая дзейнічала пры Л. І. Брэжневе і прыйшла ёй на змену, насіла кансерватыўны характар. У сваю чаргу, *трансфармаваныя* палітычныя сістэмы дзеляцца на *рэакцыйныя*, якія арыентуюцца на мінулыя, нераадоленыя вобразы сацыяльнага і палітычнага жыцця, і *прагрэсіўныя*, якія маюць на мэце фарміраванне грамадства новага тыпу.

Палітычныя сістэмы падраздзяляюцца на *адкрытыя і закрытыя*. Для адкрытых сістэм характэрны дынамічная структура і шырокія ўзаемасувязі з асяроддзем. Закрытыя сістэмы маюць жорстка фіксаваную структуру і мінімальную сувязь з асяроддзем. У якасці прыкладаў закрытых палітычных сістэм можна прывесці сістэмы, якія існавалі ў СССР і КНР. Гэтыя палітычныя сістэмы моцна абмяжоўвалі свае кантакты са знешнім асяроддзем.

Г. Экстайн выдзяляў сістэмы, заснаваныя на кансэнсусе (напрыклад, Вялікабрытанія); інтэграваныя механічна на аснове раздзелу палітычнай адказнасці (ЗША); абшчынныя, якія абапіраюцца на адносіны салідарнасці паміж адасобленымі групамі.

У залежнасці ад характару сувязей палітычныя сістэмы могуць быць *цэласнымі* (арганічнымі) або *суматыўнымі*. Там, дзе адносіны (як праявы якасцей) паміж элементамі палітычнай структуры носяць узаемапранікальны, узаемаабумоўлены характар, фарміруюцца арганічныя сістэмы. Менавіта яны складаюць цэлае, уласцівасць якога больш сумы ўласцівасцей яго частак. Там, дзе адбываецца простае злучэнне якасцей, узнікаюць сумацыўныя сістэмы, якія нараджаюць цэлае, уласцівасць якога роўна суме ўласцівасцей яго частак.

Важна не забываць аксіёмы:

а) кожная палітычная сістэма мае сваю ўласную структуру;

б) усе палітычныя сістэмы здзяйсняюць адны і тыя ж функцыі;

в) любая палітычная сістэма шматфункцыянальная;

г) усе палітычныя сістэмы змешаны ў культурным сэнсе.

Такім чынам, палітычная сістэма грамадства ўяўляе сабой адну з падсістэм побач з эканамічнай і духоўнай, якія выдзяляюцца на прымеце сферы жыццядзейнасці сацыяльных груп. Раскрываючы функцыі і тыпы палітычнай сістэмы грамадства, паліталогія дае магчымасць не толькі зразумець і асэнсаваць сутнасць і змест палітычнай сістэмы, але і

прадбачыць магчымыя навароты. Яна дае ў рукі практыкам інструмент, які дазваляе накіраваць палітычны працэс у патрэбнае рэчышча.

## 3.2. ПАЛІТЫЧНЫ РЭЖЫМ

Паняцце "палітычны рэжым" займае ў паліталогіі даволі важнае месца, бо яно абагульняе рэальную дынаміку функцыянавання палітычнай сістэмы ў сукупнасці яе элементаў. Даследаванне палітычных рэжымаў абумоўлівае знаёмства з такімі праблемамі палітычнага жыцця як раўнапраўе, справядлівасць, свабода, суадносіны асобы і ўлады, грамадства і чалавека, грамадзянскай супольнасці і дзяржавы. Гэта ставіць у цэнтр увагі праблему дэмакратыі ў якасці зыходнага пункту характарыстыкі розных палітычных рэжымаў, што асабліва актуальна на сённяшнім этапе гістарычнага развіцця сусветнага супольніцтва і садружнасці незалежных дзяржаў. У адпаведнасці з гэтым, рэкамендуем засяродзіць увагу на наступных асноўных пытаннях.

1. **Палітычны рэжым: паняцце і сутнасць.**
2. **Тыпы палітычных рэжымаў і іх характарыстыка.**
3. **Праблемы пераходу ад таталітарызму і аўтарытарызму да дэмакратыі.**

① У сучаснай палітычнай навуцы існуюць розныя надыходы да вызначэння тэрміна "палітычны рэжым". У айчынным грамадазнаўстве да нядаўніх часоў палітычны рэжым разглядаўся як сукупнасць прыёмаў і метадаў, з дапамогай якіх правячы клас ажыццяўляе сваё эканамічнае і палітычнае панаванне.

Аднак такое класавае разуменне сутнасці палітычнага рэжыму не дазваляе раскрыць функцыянальны бок палітычнай сістэмы і ступень развіцця дэмакратыі ў канкрэтнай краіне.

У Заходняй паліталогіі тэрмін "палітычны рэжым" ужываецца ў сэнсе "стан усёй палітычнай сферы жыцця грамадства". Дастаткова распаўсюджаным з'яўляецца вызначэнне, дадзенае французскім палітолагам Ж.-Л. Кермонам. Пад палітычным рэжымам ён разумее сукупнасць элементаў ідэалагічнага, інстытуцыйнага і сацыялагічнага плана, якія спрыяюць фарміраванню палітычнай улады канкрэтнай краіны на пэўны перыяд.

Можна сказаць, што палітычны рэжым — гэта спосабы і метады палітычнага ўладарання, пэўны парадак узаемаадносін паміж грамадствам і палітычнай уладай, які ўказвае на перавагу або дэмакратыі або дыктатуры.

Асноўнымі фактамі, якія вызначаюць сутнасць палітычнага рэжыму, з'яўляюцца:

— роля, палітычныя функцыі і месца кіраўніка дзяржавы ў сістэме